та Быхаўскага р-на Магілёўскай акругі (да 26.7.1930). У школе ў 1924 працавалі драм. і прыродазнаўчы гурткі, хата-чытальня, б-ка. У 1926 — 186 двароў, 1070 ж. З 20.2.1938 у Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з пач. ліп. 1941 да канца чэрв. 1944 Г. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. 11.4.1960 Глухскі с/с ліквідаваны, 15.1.1965 адноўлены. У 1976 да Г. далучана в. Зарэчча. У 1982 — 249 двароў, 525 ж. У 1997 — 214 гаспадарак, 443 ж.

У 2011 вучэбна-пед. комплекс дзіцячы сад—сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, урачэбная амбулаторыя, аптэка, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», сталовая, 2 магазіны. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Мемар. дошка земляку — Герою Сав. Саюза С.А.Красоўскаму (1897—1983).

**ГЛУША**, пасёлак у Бабруйскім р-не. За 22 км на ПдЗ ад г. Бабруйск, 17 км ад чыг. ст. Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, 132 км ад Магілёва, на аўтадарозе Бабруйск—Слуцк. Цэнтр Глушанскага пасялковага Савета. 1,3 тыс. ж. (2011).

Узнікла ў Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губ. ў сувязі з будаўніцтвам шклозавода (засн. ў 1896). У 1907 — 354 ж. У 1917 вёска, 96 двароў, 581 ж. З 1919 у БССР. З 17.7.1924 у Бабруйскім р-не, да 26.7.1930 Бабруйскай акругі. З 1931 цэнтр Рымавецкага с/с. З 15.7.1935 рабочы пасёлак. З 20.2.1938 у Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 27.6.1941 да 27.6.1944 Г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. Са студз. 1942 да сак. 1943 дзейнічала антыфаш. падп. група (больш за 40 чал., кіраўнік І.Р.Гарнастай). З 20.9.1944 у Бабруйскай, з 8.1.1954 зноў у Магілёўскай абласцях. З 11.4.1960 цэнтр пасялковага Савета. У 1970 — 1943 ж. У 1997 — 1,7 тыс. ж. З 23.11.2011 пасёлак.

У 2011 вучэбна-пед. комплекс сярэдняя школа—сад, школа мастацтваў, Дом культуры, Цэнтр рамёстваў, б-ка, бальніца, аптэка, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», 2 магазіны, бар, сталовая. У Г. пахаваны бел. пісьменнік А.Адамовіч (1927—94), які правёў тут дзіцячыя і юнацкія гады. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**ГЛУШАКОЎ** Валерый Ігнатавіч (1.9. 1926, г. Бабруйск — 3.4.2005), беларускі спявак (лірычны тэнар). Нар. артыст Беларусі (1964). Скончыў Бел.



*В.І.Глушакоў.*

кансерваторыю (1956). З 1954 саліст Бел. філармоніі, у 1956—88 — Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі. Валодаў гібкім голасам цёплага тэмбру, майстэрствам стварэння псіхалагічна выразных вобразаў. Сярод роляў: Андрэй, Супонька, Пётр («Калючая ружа», «Калі ападае лісце», «Зорка Венера» Ю.Семянякі), Уронак («Яснае світанне» А.Туранкова), Марцін («Міхась Падгорны» Я.Цікоцкага), Уладзімір Ігаравіч («Князь Ігар» А.Барадзіна), Юродзівы («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Рудольф («Багема» Д.Пучыні) і інш.

**ГЛУШАКО́Ў** Ігар Валер'евіч (н. 29.12. 1953, Мінск), беларускі музыказнавец. Сын *В.І.Глушакова.* Канд. мастацтвазнаўства (1989). Скончыў Бел. кансерваторыю (1978). З 1978 рэдактар перадач Бел. тэлебачання, з 1981 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. У 1989—2002 у Бел. пед. ун-це (у 1991—99 заг. кафедры). Даследуе праблемы бел. муз. мастацтва. Аўтар манаграфій «Класічная драма на беларускай опернай сцэне» (1990), «Сусветная мастацкая культура» (2003), адзін з аўтараў кн. «Музычны тэатр Беларусі, 1917—1959» (1993) і інш.

**ГЛУШАКО́Ў** Уладзімір Сцяпанавіч (н. 7.4.1952, г. Давыд-Гарадок Столінскага р-на), беларускі пісьменнік. Вучыўся ў БДУ (1976—78). Скон-



*У.С.Глушакоў.*

чыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1982). У 1979—88 працаваў у час. «Нёман», з 1991 у час. «Беларуская думка». У 1999—2001 намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь. У 2003—07 у Ін-це сац.-паліт. даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аўтар аповесцей «Насенне» (1981), «Маскоўская Адысея» (2009), раманаў «Цвіценне каліны» (1987), «На кругі свае» (1990), «Расплата» (1993), зб. эсэ, «Цёплае лісце таполяў» (1984), кніг публіцыстыкі «Беларусь маладая» (1998), «Новая Беларусь» (2001, абедзве з У.Вялічка і В.Шырко). Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

*Тв.*: Развітанне на пачатку вясны: сямейная хроніка. Мінск, 2001.

*І.М.Гоўзіч.*

**ГЛУ́ШКАВІЧЫ**, вёска ў Лельчыцкім р-не. За 45 км на ПдЗ ад г.п. Лельчыцы, 98 км ад чыг. ст. Муляраўка на лініі Лунінец—Калінкавічы, 265 км ад Гомеля. Цэнтр Глушкавіцкага с/с. 731 гаспадарка, 2178 ж. (2011).

Вядомы з 16 ст. як вёска ў Кіеўскім ваяв. Каралеўства Польскага. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі. У 1816 — 419 ж. У 1834 сяло ў складзе Тураўскага ка-